# Школьная планета

***НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!***

***№ 5 (52) СТУДЗЕНЬ 2019***

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*


Указ Президента Республики Беларусь
от 20 июня 2018 года № 247

О проведении
ГОДА МАЛОЙ РОДИНЫ

В целях стимулирования социально-экономического развития регионов, формирования активной гражданской позиции у населения, сохранения историко-культурного и духовного наследия ПОСТАНОВЛЯЮ:

1. Провести в Республике Беларусь 2018-2020 годы под знаком Года малой родины.

2. Совету Министров Республики Беларусь:

совместно с облисполкомами и Минским горисполкомом разработать и утвердить республиканскую программу мероприятий по данной тематике до 2020 года;

обеспечить координацию деятельности государственных органов, других организаций по выполнению названной программы.

3. Настоящий Указ вступает в силу со дня его официального опубликования.

Президент
Республики Беларусь А.Г.Лукашенко





# Чаму жоўты і земляны: пяць стыхій і колераў

*Практычна ўвесь 2019 год з намі будзе жоўты Земляны Кабан. Ва ўсходнім гараскопе 12 звяроў: Пацук, Бык, Тыгр, Трус (або Кот), Цмок, Змяя, Конь, Авечка (Каза), Малпа, Певень, Сабака і Кабан. Паводле легенды, яны ідуць у такім парадку, бо менавіта так, адзін за адным, звяры прыйшлі да нябеснага імператара, калі той паклікаў іх да сябе. У падарунак за тое, што на сваім шляху яны змаглі пераадолець шырокую раку, кожны з іх атрымаў сабе год.*



Усе жывёлы ў гараскопе валодаюць сваімі характарыстыкамі. Да прыкладу, Тыгру ўласцівыя смеласць і сіла, але пры гэтым ён павінен заўсёды кіравацца толькі прынцыпам справядлівасці ў сваіх учынках. Малпе ўласцівы спрыт, але разам з тым і некаторая зменлівасць і т .д.




Акрамя жывёл, усходні гараскоп мае ў аснове пяць стыхій: зямля, дрэва, агонь, метал і вада. Менавіта з гэтай пяцёркі, паводле вераванняў старажытных кітайцаў, складаюцца наогул усе жывыя істоты і прадметы ў свеце.

Кожнай стыхіі адпавядаюць свае колеры. Напрыклад, у зямлі гэта жоўты, або карычневы, які сімвалізуе надзейнасць і сталасць. Агонь, вядома ж, чырвоны – гэта дынаміка і энергія. Колер вады – сіні (або чорны), гэтая стыхія адказвае за мудрасць і творчасць. Метал белага колеру, ён кажа аб раўнавазе і справядлівасці. І, нарэшце, стыхіі дрэва адпавядае зялёны колер, ён увасабляе зараджэнне ўсяго існуючага.

Але і гэта яшчэ не ўсё. У кітайскім гараскопе таксама дзейнічае мужчынскі (Ян) або жаночы (Інь) прынцып. Мужчынскія знакі гэта Пацук, Тыгр, Цмок, Конь, Малпа, Сабака, а жаночыя – Бык, Кот, або Трус, Змяя, Авечка (Каза), Певень, Кабан (Свіння).

А зараз збяром усё разам. У 2019-м наступіць год жоўтага землянога кабана. Заснаваны на жаночым пачатку, ён прынясе з сабой імкненне да захавання і стварэння. У цане таксама будуць такія “земляныя” якасці, як надзейнасць і грунтоўнасць, а Кабан дадасць упартасці ў дасягненні мэтаў і працавітасці.

***Матэрыял падрыхтаваны пры дапамозе інтэрнэт-сайтаў***

# Прыйшла каляда, дзверы адчыняйце! Калядоўшчыкаў у хату шчыра запрашайце!



***Сёння для многіх Каляды і Каляда - гэта два святы, якія складана адрозніць. Але гэта зусім не так. У часы паганства, калі хрысціянства на Русі яшчэ не было, свята Каляда ўжо існавала. Прысвячалася яно не Ісусу Хрысту, а забытаму цяпер Дажбогу. Людзі радаваліся прыбытку дня і дзякавалі Богу за гэта, выконваючы песні-калядкі.***

***Што такое Каляда?*** *Каляда - славянскае свята, якое сёння праходзіць з 7 да 19 студзеня. У гэтыя дні праводзяцца абрады, якія прысвечаны Калядам. Раней жа Каляда пачыналася з Каляд, 25 снежня, і заканчвалася 6 студзеня.*

***Як рыхтаваліся і святкавалі Каляду раней?*** *Да Каляды рыхтаваліся загадзя і надавалі гэтаму вялікую ўвагу. Гаспадыні імкнуліся прыгатаваць як мага больш смачных страў, прыбіралі ў хаце.*



*Калі надыходзіў дзень святкавання, пачыналася ўрачыстасць, і ішла яна па вызначаным сцэнарыі. Людзі ішлі да храмаў, дзе праводзілі абрады ахвярапрынашэння. У ахвяру прыносілі хатнюю жывёліны ці птушку, чыя кроў павінна была праганяць злых духаў.*

*Даўней святкаванне Каляд адзначалася шумна. Моладзь збіралася для хаджэння па хатах у вялікія кампаніі. Неслі на тычцы сонца, сімвал свята, а пасля прыходу хрысціянства сонца было заменена на зорку (сімвал нараджэння Ісуса). Натоўп стукаў у вёдры палкамі і лыжкамі, гучна крычаў на розны лад. Калі асноўная частка была скончана, людзі прыступалі да святочнай трапезы. На другі дзень, узяўшы з сабой пірагі, людзі ішлі калядаваць. Першымі выступалі заўсёды дзеці, потым дзяўчаты, а ўжо потым дарослыя жанчыны і мужчыны.*

***Як адзначалася Каляда ў апошняе стагоддзе?*** *За апошнія сто гадоў правілы практычна не мяняліся. На свята Божага Нараджэння, 7 студзеня, людзі накіроўваліся ў госці да хроснікаў, каб павіншаваць іх. Увечары прыбраная ў святочныя касцюмы моладзь ішла спяваць калядкі. Важна, што адзін чалавек у групе абавязкова павінен быў быць у касцюме казы.*

*Гаспадары слухалі песні, глядзелі на танцы, дзякавалі і ў адказ раздавалі смачную ежу (печыва, кексы, торцікі, каўбасу – што ёсць). Не пусціць калядуючых адважваліся не шматлікія, так як гэта дурная прыкмета.*



***Верыць у прыкметы ці не?*** *З Калядой звязаны многія народныя прыкметы. Напрыклад, не рэкамендавалася ў Каляды плесці лапці і шыць, каб дзіця нарадзілася здаровым. Калі на Каляды разыгрывалася завіруха, то можна было чакаць добрага раення пчол. Іней, які з'явіўся ў дні свята, сімвалізаваў ураджайны хлебны год. Зорнае неба – гарох урадзіцца. Дарогі не замяло - з грэчкай праблем не будзе. Хочаш, каб куры добра нясліся – пасадзі каляднікаў на парог.*

***Асаблівае месца варожб.*** *Варажылі незамужнія дзяўчаты, звычайна напярэдадні Нараджэння Хрыстова аж да 14 студзеня. Даўней верылі, што гэты перыяд самы лепшы для таго, каб даведацца пра свой лёс, убачыць будучага жаніха.*

*Рытуалаў было шмат, і кожны па-свойму цікавы. Напрыклад, дзяўчына выходзіла на двор і кідала бот праз плот. Калі бот упаў наском да дому, то аб вяселлі ў новым годзе можна было і не марыць. А вось калі наском ў іншы бок, тут ужо было зразумела, куды ботаў нос паказвае, адтуль прыйдзе будучы жаніх. Але бот павінен быў быць абавязкова з левай нагі.*



*Пра лёс можна было спытаць і ў палена. Дзяўчына выцягвала яго з заплюшчанымі вачыма і потым разглядала. Крывое, шурпатае палена азначала непрыгожага мужа, і наадварот.*

***Каляда сёння.*** *Сёння Каляда паступова забываецца, а некаторыя нават не ведаюць, што існуе такое свята. Але гэта датычыцца ў асноўным гарадоў. А вось у вёсках Каляду памятаюць і адзначаюць. Вядома, сцэнарый свята ўжо не такі аб'ёмны, як у старажытныя часы, і часта людзі абмяжоўваюцца спевам калядак і варожбамі.*

*Каляднікі, часцей за ўсё гэта дзеці, збіраюцца і абыходзяць родных, суседзяў, знаёмых, звяртаючыся да іх з просьбай дазволіць ім пакалядаваць. У адказ гаспадары запрашаюць каляднікаў, дзякуюць за святочную радасную вестку і дораць ім падарункі, гасцінцы. Сёння гэта могуць быць і грошы, а не арэшкі, прысмакі і садавіна, як раней.*

***Матэрыял падрыхтавала Аліна Жукоўская***





# Цана народнага самавызначэння



Я ляніва перавяла вочы на дошку. “Ру-жа”, – было па складах напісана там. “Ру-у-ужа, – у думках перадражніла я. – Ружа-лужа! І хто прыдумаў беларускую мову?” Здзіўлена ўздыхнуўшы, уткнулася ў сшытак. Мімаволі погляд зачапіўся за лічбу “7”, непрыгожа выведзеную на лінейцы пасля дамашняй работы. Падумаеш, пару разоў забылася рысачкі над “ў” паставіць! Вялікая справа!

– Запісваем. Практыкаванне васямнаццаць, другі сказ. Віка, калі ласка, прачытай, – Марыя Іванаўна звярнулася да мяне.

– Няма ў чалавека нічога больш пры…гожага і дара…гога за ра... ра...

– Радзіму, – падказала Марыя Іванаўна.

– ...радзіму. Чалавек без Радзімы – бедны чалавек. (Я. Колас).

Час цягнуўся павольна: кагосьці выклікалі прачытаць яшчэ адзін сказ, потым прапанавалі практыкаванне для самастойнай працы і задалі дамашняе заданне. Але вось ўрок скончыўся, усе пабеглі ў клас музыкі, а мяне папрасіла затрымацца Марыя Іванаўна. Я панура паплялася да настаўніцкага стала і плюхнулася за першую парту. Напэўна, мяне зноў чакала вымова. Ну, не разумею я гэтую беларускую мову!

– Віка, у якой краіне ты жывеш? – з цяжкім уздыхам спытала настаўніца.

– У Беларусі, – пацiснула плячыма я.

– Якая мова табе павінена быць бліжэй – руская ці ўсё-такі беларуская?

– У нас дзве дзяржаўныя мовы ... – нязгодна прамармытала я завучаную адгаворку.

Чаго ім усім ад мяне трэба? Ведаю рускую – і добра, нават выдатна! Мяне ўсюды зразумеюць. Быццам хтосьці зараз яшчэ размаўляе на “роднай мове”. Да гэтага часу ў гутарцы адна “трасянка”.

– Дзве, – важна кіўнула Марыя Іванаўна, – Але ж мова тваіх продкаў – беларуская. На ёй распавядалі казкі, паданні і легенды, прыкметы і павер'і, спявалі лірычныя балады, жартоўныя і нават гістарычныя песні. А колькі выдатных апавяданняў, вершаў, аповесцей, паэм было напісана на беларускай мове! Любую мову варта вывучыць толькі дзеля таго, каб пазнаёміцца з творчасцю народа. А калі гэты народ – твой...

Наткнуўшыся на мой нудны погляд, настаўніца яшчэ раз уздыхнула і ўручыла мне кнігу. “Якуб Колас. Сымон-музыка”, – прачытала я. Шматспадзеўна. З самым удзячным выглядам узяўшы кнігу, я хутчэй панеслася на ўрок. Чытанне было адкладзена ў доўгую скрыню.

Ішлі дні. Першая чвэрць скончылася, пачаліся канікулы. Ад “няма чаго рабіць” я ўзяла ў рукі забытую кнігу. З цяжкасцю прачытала першыя некалькі старонак. Затым – яшчэ некалькі. А потым проста не змагла адарвацца, пакуль не скончылася апошняя старонка. Некалькі хвілін я сядзела, быццам у трансе. Мне ніяк не верылася, што я змагла зразумець і душрй адчуць нешта, напісанае на такой незразумелай, такой далёкай беларускай мове! З першых радкоў і да фінальнай кропкі мне лёгка запомнілася кожнае новае слоўца, стала правільнай кожная літара, што раней здавалася недарэчнай, і простыя, “мужыцкія”, выразы зайгралі новымі фарбамі народнай мудрасці.

За гэтай кнігай рушылі ўслед іншыя: некалькі зборнікаў беларускіх народных казак, байкі Кандрата Крапівы, п'еса Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча “Пінская шляхта”, аповесць Янкі Маўра “Палескія рабінзоны” і многае іншае! Але самае вялікае ўражанне на мяне зрабіла паэма Якуба Коласа “Новая зямля”, прачытаная адразу ж пасля “Сымона-музыкі”.



Дзякуючы творчасці Якуба Коласа, я зразумела цану народнага самавызначэння, пачала актыўна вывучаць беларускую мову і шчыра палюбіла яе.

***Лапцёнак Вікторыя, вучаніца 10 “А” класа***

***Прысвечана 100-годдзю першага выдання паэмы Якуба Коласа “Сымон-музыка” і 95-годдзю паэмы “Новая зямля”***

# Птушка года Беларусі



**Вялікі падорлік**

Птушкай 2019 года ў Беларусі абвешчаны ***вялікі падорлік***, паведамілі БЕЛТА ў грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" (АПБ). Увесь год у Беларусі будуць праходзіць мерапрыемствы, прысвечаныя гэтай птушцы. Да іх могуць далучыцца дарослыя і дзеці. "***Вялікі падорлік*** – у ліку рэдкіх драпежных птушак Еўропы, ёй пагражае знікненне. Адна з самых вялікіх яе папуляцый у свеце гняздуецца ў Беларусі. 120-150 пар гэтых птушак жыве ў нашых лясах – гэта больш, чым ва ўсім Еўрасаюзе", - адзначылі ў АПБ. Гэтыя птушкі любяць глухія месцы на балотах і каля балот. "Вялікаму падорліку пагражае мноства фактараў. Сярод іх знікненне нізінных балот – галоўных месцаў пражывання гэтай птушкі, з'яўленне паблізу чалавека ў перыяд гнездавання. Калі ў гэты час хто-небудзь будзе хадзіць каля гнязда, вялікі падорлік яго пакіне", - растлумачылі ў грамадскай арганізацыі. Каб захаваць папуляцыю вялікага падорліка ў Беларусі, АПБ ужо некалькі гадоў праводзіць акцыю "Выратуй Арляня". Арганізуюцца экспедыцыі для пошуку гнёздаў, каб затым аддаць гэтыя месцы пад ахову. Нацыянальная кампанія "Птушка года" АПБ праводзіцца з 2000-га года. Птушкай 2018 года ў Беларусі быў Чарнагаловы шчыгол.



**Чарнагаловы шчыгол**

***Матэрыял belta.by***



# Санкі, лыжы, зімовыя гульні…
















berezino2.school.by

# *Дом, у якім утульна ўсім!*

*№ 52, студзень 2019 г.*





***Малюнак Анастасіі Бурай, вучаніцы 7 “А” класа***
***Прысвечана 100-годдзю першага выдання паэмы***
***Якуба Коласа “Сымон-музыка”***

***У яго быў свет цікавы,***
***Свае вобразы, жыццё,***
***І ў душы яго ўсе з’явы***
***Сваё мелі адбіццё.***
***Ён і рэха сваё кліча***
***І размову вядзе з ім...***

***(Урывак з паэмы Якуба Коласа “Сымон-музыка”)***






ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц. Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Кацярына Бубенька, Паліна Кузіна, Паліна Маркевіч, Вікторыя Лапцёнак, Анастасія Бурая, Марына Лапцёнак, Аліна Жукоўская, Яна Сюмак